ГАЗЭТА РАБОЧА-СЯЛЯНСКАЙ МОЛАДЗІ БЕЛАРУСІ

ПРОЛЕТАРЫ ЎСІХ КРАЁЎ, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

ЧЫРВОНАЯ ЗЬМЕНА

ОРГАН ЦЭНТРАЛЬНАГА І МЕНСКАГА КОМІТЭТАЎ ЛЕНІНСКАГА КОМУНІСТЫЧНАГА САЮЗУ МОЛАДЗІ БЕЛАРУСІ

№ 121 (503) Чацьвер, 27 кастрычніка 1927 г. | Выходзіць тры разы на тыдню у аўторак, чацьвер і суботу | Год выд. VII. | Рэдактар прымае ад 12 да 2 гадз. дню. Сакратар ад 10—12 і ад 2—3 гадз. Тэл. № 903. | Адрас рэдакцыі газэты „Чырвоная Зьмена“: Менск, Комсам. 25.

Т.т. Зіноўеў і Троцкі выключаны з складу ЦК УсеКП(б).

Пастанова аб'яднанага пленуму ЦК і ЦКК УсеКП(б) ад 23 кастрычніка 1927 году.

Аб'яднаны пленум ЦК і ЦКК у жніўні 1927 году праявіў высокую ступень цярплівасьці і ўступчывасьці ў адносінах т.т. Троцкага і Зіноўева, даўшы магчымасьць гэтым таварышом споўніць сваё абяцаньне ад 8-га жніўня аб зьнішчэньні элемэнтаў фракцыйнасьці і абмежаваўшыся папярэджаньнем, якое было апошнім папярэджаньем.

Аднак, т.т. Троцкі і Зіноўеў у другі раз абманулі партыю і грубейшым образом парушылі ўзятыя імі на сябе абавязкі, ня толькі ня зьнішчыўшы „элемэнтаў фракцыйнасьці“, але, наадварот, давёўшы фракцыйную барацьбу супроць партыі і яе адзінства да ступені, якая граніччыць з стварэньнем новай анты-ленінскай партыі супольна з буржуазнымі інтэлігентамі.

З прычыны гэтага, аб'яднаны пленум ЦК і ЦКК пастанаўляе: т.т. Троцкага і Зіноўева з складу ЦК **выключыць**.

Аб'яднаны пленум ЦК і ЦКК пастанаўляе далей усе даныя аб раскольніцкай дзейнасьці лідэраў троцкісцкай опозіцыі (організацыя нелегальнай антыпартыйнай друкарні для разбурэньня партыі, блёк з рэнегатамі Маславым, Рут Фішар, Суварыным для разбурэньня Комінтэрну і г. д.), роўна, як групу т. В. Сьмірнова-Сапронава прадставіць на разгляд XV зьезду партыі.

Каля апошняе мяжы.

З артыкулу сакратара ЦК КП(б)Б тав. В. КНОРЫНА.

Прынцыпова палітычныя памылкі опозыцыі пасьля 14-га зьезду былі яшчэ зусім папраўнымя. Дзеля гэтага трэба было толькі жаданьне працаваць з партыяй і на падставе партыйных пастаноў. Такога жаданьня ў опозыцыі ня было, правадыры опозыцыі плявалі на пастановы зьезду і на волю партыі і Комінтэрну. Опозыцыя, настойваючы на сваіх параўнальна яшчэ невялікіх памылках, абярнула іх ужо ўлетку 1926 г. у памылкі вялікія, у соцыял-дэмократычны ўхіл. За гэтыя памылкі ўхапіўся тав. Троцкі і трацкістыя Прэабражэнскі, Сэрабракоў, Сьмірноў і інш., якія маюць куды большыя памылкі і якія змагаліся на працягу многіх год супроць нашай партыі. За гэтыя памылкі ўхапіўся Шляпнікаў і Мядзьведзяў, Сапронаў і Дашкоўскі, якія знаходзіліся даўно на шляху да меншавізму чыстай вады. Так званая новая опозыцыя ішла на блёк і з Троцкім, і з Шляпнікавым, і з Сапронавым, і з Дашкоўскім. Яна стала арганізуючым цэнтрам асколкаў усіх разьбітых у свой час дробна-буржуазных плыняў, ультра-левых і правых, і адзіночак ва УсеКП(б). Стаўшы на шлях фракцыйнасьці, опозыцыя яшчэ ўлетку 1926 г. пачала гуляць з ідэяй дзьвюх партый і вельмі абвастрыла свае антыленінскія ўхілы. Для гэтага яшчэ ў ліпені 1926 году аб'яднаны пленум ЦК і ЦКК павінен быў вывесьці з Палітбюро тав. Зіноўева, як фактычнага кіраўніка фракцыйнай работай, і тав. Лашэвіча са складу членаў ЦК, як організатара нелегальнага сходу супроць партыі, «папярэдзіўшы адначасова ўсіх опозыцыянэраў, незалежна ад іх становішча ў партыі, што працяг працы па стварэньні фракцыі супроцьлеглай партыі прымусіць ЦК і ЦКК, для абароны адзінства партыі, зрабіць і ў адносінах да іх адпаведныя вывады» (пастанова пленуму ЦК і ЦКК у ліпені 1926 г.).

Ня маючы надзеі заваяваць хоць-бы адну партыйную організацыю, опазыцыя пашла па шляху стварэньня другое нелегальнае партыі, роўналежнае з нашай партыяй, з сваімі членскімі ўзносамі і камітэтамі. Ня маючы магчымасьці заваяваць які-б то ні было ўплыў, хоць-бы ў аднэй з сэкцый Комінтэрну, опозыцыя пашла па шляху аб'яднаньня выключаных з Комінтэрну опозыцыйных груп (Рут Фішар, Маслаў і Урбанс у Нямеччыне, Суварын і Монат ва Францыі, Снэфліт у Галяндыі і г. д.) для барацьбы супроць Комінтэрну і УсеКП(б).

Націск дробна-буржуазных мас, якія акружаюць опозыцыю і прабуюць бачыць у ей сьцяг для барацьбы супроць компартыі і савецкае ўлады, з аднаго боку, і неабходнасьць абаперціся на па-за партыйныя сілы супроць партыі, прымушае опозіцыю скачвацца да чыстае вады меншавізму, парушаючы ўсе прынцыпы ня толькі партыйнай, але і савецкай дэмократыі. Усё гэта прывяло да таго, што ў сучасны момант ужо характарыстыка опозыцыі, як соцыял-дэмократычнагу ўхілу, зьяўляецца няправільнай. Мы ўжо маем справу не з соцыял-дэмократычным ухілам, а з яўна акрэсьленай соцыял-дэмократычнай, меншавіцкай плыньню.

Але калі з ідыёвым апартунізмам у шэрагах нашай партыі мы можам змагацца мерамі партыйнага пераконаньня, мерамі растлумачэньня, дык яўна раскольніцкая работа опозыцыі, якая выяўляецца ў організацыі нелегальных сходаў, у стварэньні нелегальных друкарань, у выкарыстаньні дзяржаўных друкарань супроць партыі і супроць дыктатуры пролетарыяту патрабуюць прыняцьця больш рашучых мер. Партыя выкарыстала ў адносінах да правадыроў опозыцыі ўсе меры пераконаньня, але далей абмяжоўвацца толькі мерамі пераконваньня было-б злачынствам з боку партыйнага кіраўніцтва супроць партыі. Цэнтральны Камітэт і Цэнтральная Контрольная Камісія, якія адказваюць за захаваньне ленінскага адзінства партыі і за моц дыктатуры пролетарыяту ў нашай краіне, ня могуць дапусьціць стварэньня другое партыі роўналежна з нашай партыяй і выкарыстаньнем унутрыпартыйнай дэмократыі ў інтарэсах афармленьня новай трацкісцкай партыі. Цэнтральны Камітэт і Цэнтральная Контрольная Камісія, бачачы, што опозыцыя ў сваёй барацьбе супроць партыі пачынае апірацца на яўна буржуазныя элемэнты, выкарыстоўваючы іх для свае тэхнікі, ядналючыся з імі ў палітычнай барацьбе супроць ЦК, ня можа ў далейшым дапусьціць працягу такое дзейнасьці з боку опозыцыі. Таму, апіраючыся на ленінскае вучэньне і на напісаныя Ленінымі пастановы X зьезду РКП(б) аб барацьбе з фракцыйнасьцю ўнутры партыі, Цэнтральны Камітэт і Цэнтральная Контрольная Камісія пастанавілі выключыць т. т. Троцкага і Зіноўева, як кіраўнікоў опозыцыйнай барацьбы супроць партыі, са складу ЦК.

Мы ўпэўнены, што ўся наша партыя і шырокія рабочыя масы жадаюць адзінства, і толькі адзінства, на асновах ленінізму. Мы ўпэўнены, што ўся наша партыя аднадушна ўхваліць рашучую барацьбу, якую праводзіць ЦК і ЦКК супроць дэзорганізатароў ленінскае партыі, супроць арганізатараў другое, трацкісцкае партыі.

В. Кнорын.

Дарагія госьці

(Ад нашага ленінградзкага корэспондэнта).

Ужо з вечара чакаюць чырвонафлётцы дарагіх гасьцей. Дагаворанасьць поўная: організацыя „на мазі“.

Каля 8 гадзін раніцы, калі ішла звычайная карабельная прыборка, тэлефон папярэдзіў: „Сябры ЦВК СССР выехалі на лінкор „Парыская Комуна“.

Выехалі значна раней вызначанага часу — вялікае жаданьне ўбачыць баявы карабель.

...На палубе 150 сяброў ЦВК. Прадстаўнікі ўсіх нацыянальнасьцяў Савецкага Саюзу знаёмяцца з магутным вартаўніком марскіх межаў іх соцыялістычнай бацькаўшчыны. Большасьць на караблі ўпяршыню — і тым мацней уражаньне.

Весела праходзіць час...

Уся каманда ў зборы, згрудзіўшыся каля вежы і вэнтыляцыйных грыбоў. Тут-жа і сябры ЦВК СССР. Камісар адчыняе мітынг.

Гарачае слова да мараноў трымае старшыня Савнаркому Нямецкай Комуны тав. Курц. А за ім — рабочы заводу імя Марці з Нікалаева тав. Фамін, хлебароб з Паўночнага Каўказу — Карпенка. Ува ўсіх шчырае прывітаньне на вуснах, упэўненасьць у слевах. Аплот, забарона марскіх подступаў да гораду Леніна — у цьвёрдых руках! Гэта — асноўны матыў усіх прамоў.

Разьвітваюцца ўсхвалёваныя.

Гарніст іграе „захождение“ і каманда застыла ў „сьмірна“, выцягнуўшыся чорнай і стужкай па ўсяму барту — ад бака да юта. Адбой — і гучнае „ура“ нясецца ўсьлед адыходзячаму буксіру, якога ўжо акутваюць пялёны васеньняга туману..!

Я. Н.

ПЕРАД СУДОМ ЯЧЭЙКІ.

Што кажуць перавыбары бюро ячэек.

Працу бюро ячэек перабіраем па костачках.

Яго справаздача

Як прышлося Міхайлу Ігнаценку — сакратару Каратковіцкай ячэйкі — на перавыбарчым сходзе рабіць справаздачу аб праробленай бюро працы, ён моцна прызадумаўся.

— Што я скажу? Што бюро зрабіла? Чаму ня выканалі пляну? Чым абараніць маё п'янства? — Цэлы шэраг такіх пытаньняў мучыў Міхайлу, яго мазгі ператваралі ў кіслую капусту.

Але „дзе чорт ня зможа, там баба дапаможа“. Таксама і тут. — „Адзін розум добра, а два яшчэ лепш“. — сказаў сабе Ігнаценка і пачаў цягаць сказы і думкі з брошуры Чапліна — „Два гады працы ў новай паласе“. Толькі два вечары патраціў Міхайла на падрыхтоўку, а даклад вышаў на „зэкс“.

Цяпер перад сакратаром стаяла новая проблема — зрабіць даклад як найлепш, каб у прысутных склаўся пагляд, што ён самы разумны, што калі нічога ня зроблена, — значыць прычыны на гэта ёсьць, значыцца так і быць павінна.

Быў даждлівы дзень восені. Сівы вохкі туман сваімі касматымі грудзьмі шчыльна прылягаў да зямлі.

Міхайла забраўся у манеж, узяў у рукі напісаны даклад, самотна агляніўшыся растаўленыя каля сьцен кулеўі, быццам гэта былі хлопцы з ячэйкі, пачаў рэпэтыравацца, падмацоўваючы словы рознымі выбрыкамі голасу і жэстаў...

...Пачаў Ігнаценка свой даклад на ячэйцы з агульных задач комуністычнага саюзу моладзі, пералічыў усе этапы яго разьвіцьця, асабліва застанавіўся на часе ваеннага комунізму і перакінуўся у „новую паласу“. Закончыў ён даклад наступнымі завучцнымі словамі:

— Ня крытыкай мінулага бюро, а таварыскай дапамогай новаму — мы нашу ячэйку падымем на належную вышыню.

У кожнага было шмат думак, але ўсе покуль што маўчалі.

Арынка першая разьвязала вялікі мех гэтых маўчаньня:

— Як выбіралі вас у бюро, дык ячэйка дала шмат дырэктыў. Чаму пра іх ты нічога не сказаў?

— Ага... Верна... і я хацеў аб гэтым спытацца...— выскаквалі словы з сходу, як бурбалкі з вады, калі ўкінеш у канаву купіну.

Запісваў Віхайла на паперку гэтыя словы, моцна кусаў зубамі то ніжнюю, то верхнюю губу, быццам на іх сядзеў падсохшы вогнік. і шукаў выйсьця...

...За Ігнаценку ў новае бюро галасавала толькі два чалавекі.

З. Гарошын.

„Па костачках перабралі“.

(Жыліхаўская яч. ЛКСМБ, Бабруйскае акругі).

Перавыбары бюро ячэйкі у нас адбыліся 15 кастрычніка.

У спрэчках па справаздачы бюро выступіла 80 процантаў усіх прысутнічаўшых на сходзе.

Усе недахопы, прамахі, заганы ў працы бюро і ячэйкі былі выяўлены.

Комсамольцы адзначалі недахопы і выносілі свае прапановы для іх зьнішчэньня у далейшай працы. Абгавараючы культурна-масавую працу сярод вясковай моладзі, таварышы выносілі прапановы — **наладжваць рэгулярна сходы моладзі, адчыніць вячэрнюю школу сялянскай моладзі, ўцягнуць моладзь у гурткі, ахапіць комсамольскім уплывам вячоркі і г. д.**

Шмат увагі у спрэчках было зьвернута на ваенізацыю, на грамадзкую і гаспадарчую працу, на працу сярод дзяцей, батракоў, а гэтаксама і на ўнутрывыхаваўчую працу у ячэйцы. У рэзолюцыі ўсе гэтыя моманты адзначаны, паказан практычны падыход да ажыцьцяўленьня намечаных задач.

У новы склад бюро прайшлі двое новых, маладых таварышоў. Сакратаром ячэйкі выбраны кандыдат партыі. Адзін член бюро — серадняк, астатнія 2 і кандыдаты — беднякі.

Два члены бюро і два кандыдаты — сябры сельсавету.

Работу ячэйкі, як кажуць, па костачках перабралі, праверылі яе ад стану пратаколаў да правядзеньня гаспадарчых і культурных мерапрыемстваў. Застаецца пажадаць новаму бюро энэргіі і пасьпяховасьці ў працы.

М. Шпілеўскі.

Абнавілі на 65 процантаў.

(Чашнікі, Віцебская акруга).

Некалькі дзён таму назад у нашых чашніцкіх ячэйках № 1 і 2 адбыліся перавыбары бюро ячэйкі.

Прысутнасьць комсамольцаў на перавыбарчых сходах было 90—95 проц.

Па справаздачы бюро было шмат выступленьняў. У сваіх прамовах таварышы адзначалі добрае і дрэннае ў працы і жыцьці ячэйкі.

Кандыдатуры у новае бюро высоўвалі комсамольцы — радавікі і перад галасаваньнем **усебакова іх абгаварвалі.**

Новы склад бюро абноўлен на 65 процантаў. Партыйнае і пролетарскае кіраўніцтва забясьпечана. Пакідалі сход комсамольцы з вялікай упэўненасьцю ў тое, што **новае бюро будзе «жывым» і працаздольным.**

З. Шапіра.

Выказалася 20.

(м. Бярэзіна, Менская акруга).

17 кастрычніка профсаюзная ячэйка заслухала справаздачу бюро за шэсьць месяцаў працы. Першы раз, як вопыт у працы, мы ў гэты-ж дзень заслухалі садаклад вылучанай камісіі па абсьледваньні. Неабходна адзначыць, што камісія з дадзенымі ёй дырэктывамі ня справілася, бо да агляду працы ячэйкі падыходзіла формальна.

Ячэйка яднае 40 комсамольцаў: 31 член і 9 кандыдатаў.

Па справаздачы выказалася 20 чал.

З справаздачы і спрэчак выявілася, што бюро ячэйкі дадзеныя дырэктывы выканала.

На гаспадарчай і грамадзкай працы ячэйка значна пасунулася ўперад.

Ячэйка мае вялікія дасягненьні ў вайсковай працы: маецца вайскова-санітарны гурток, у ТСА-Авіахім уцягнута 70 чалавек.

Маюцца вялікія дасягненьні ў выпісцы газэт: раней ячэйка выпісвала 15 экзэмпляраў, цяпер 50.

З недахопаў было адзначана, што піонэрпраца за летні час аслабла з прычыны таго, што атрад ня мае свайго клюбу.

Бюро былі дадзены дырэктывы для далейшай працы на зімні тэрмін, у якіх асабліва зьвяртаецца ўвага на палітвыхаваўчую працу.

Склад бюро абнавіўся на 30 процантаў.

Д—н.

Міжнародны агляд,

Дзень за днём.

Дзякуючы здрадзе профэсыянальнай вярхушкі, забастоўка нямецкіх вуглякопаў скончылася.—Натхніцелем шпіёўства зьяўляецца ангельскі ўрад.—Вуглякопы Францыі на варце заваёў Кастрычніка.

Профбюракраты прадалі вуглякопаў.

Забастоўка нямецкіх вуглякопаў скончылася. Дэлегацкі сход профсаюзу вуглякопаў большасьцю галасоў згадзіўся з пастановай камісіі, якая складалася з прадстаўнікоў профсаюзаў і капальняўласьнікаў.

Пастанова прадугледжвае невялічкае павялічэньне заробку ў галоўным раёне сярэдняй Нямеччыны.

Такім чынам, работа ў раёне аднавілася.

Нямецкая компартыя ў сваёй газэце піша, што разгляд камісіяй гэтага пытаньня зьяўляецца ў даным выпадку падтасаванаю гульнёю.

Не зважаючы на згоду камісіі бастуючых, барацьба ў вугальным раёне мае вялікае значэньне. Бо тысячы рабочых, якія да гэтага часу былі пасыўнымі, цяпер сталі на шлях палітычнае актыўнасьці.

Нават і зараз адбываюцца шматлюдныя сходы вуглякопаў.

На гэтых сходах абмяркоўваецца згода прадстаўнікоў профсаюзу на пастанову камісіі.

Сходы выявілі сур'ёзную нездаволенасьць рабочых гэтай пастановай.

На некаторых сходах пастаноўлена протэставаць супроць пастановы камісіі.

Тым ня менш, ухвалена, заявіўшы протэст, аднавіць работу ў капальнях.

Такім чынам, дзякуючы профсаюзным бюрократам, дзякуючы таму, што вярхушка профсаюзу вуглякопаў пашла на згоду з капальняўласьнікамі, дзякуючы ўсяму гэтаму — праваліліся забастоўка вуглякопаў.

Натхніцелі шпіёўства.

Урад ангельскай буржуазіі ўвесь час імкнецца пакрыць СССР сеткаю ваеннага і экономічнага шпіёўства.

Найбольш шырокую сетку шпегаў меў у Маскве сакратар ангельскага прадстаўніцтва Чарнок.

Для ажыцьцяўленьня сваёй шпіёўскай работы, Чарнок выкарыстаў сваіх знаёмых з прадстаўнікоў былой буйнай буржуазіі.

Сярод буржуазных элемэнтаў ён вербаваў разьведчыкаў сваёй шпіёўскай організацыі.

Адначасова ён вёў разьведку па вайсковай і экономічнай лініі.

Вярхоўны суд СССР пасьля дасканальнага разгляду шпіёўскай работы прысудзіў трох сяброў гэтай організацыі да растрэлу і аднаго да пазбаўленьня волі на 2 гады.

Зьезд рэволюцыйных вуглякопаў Францыі.

У горадзе Дуэ (Францыя) адбываецца зьезд рэволюцыйнага профсаюзу францускіх вуглякопаў.

Пасьля адчыненьня зьезду, аднагалосна была прынята рэзолюцыя, у якой падкрэсьліваецца гатоўнасьць францускага пролетарыяту абараняць заваёвы Кастрычнікавае рэволюцыі.

Сакратар профсаюзу Кірш выступіў з дакладам аб задачах саюзу.

Ён адзначыў, што зараз прадпрыемцы вядуць барацьбу за зьнішчэньне васьмігадзіннага дню і за зьніжэньне заробку.

Таварыш Монмусо, — кіраўнік аб'яднаньня францускіх рэволюцыйных профсаюзаў, — у сваёй прамове зазначыў, што наступленьне прадпрыемцаў павінна сустрэцца магутным, адзіным пролетарскім фронтам.

Рабочая кляса ня пойдзе на вудачку капіталістых.

Шчыльна аб'яднаўшы свае шэрагі вакол рэволюцыйных організацый, францускі пролетарыят і надалей будзе ўпарта весьці змаганьне з капіталізмам.

Надзвычайна цікавым было выступленьне на зьезьдзе прадстаўніка нямецкіх вуглякопаў.

Ён казаў аб становішчы працоўных у Нямеччыне.

Так напрыклад, у 1917 годзе на кожную тысячу рабочых прыходзілася 167 няшчасных здарэньняў. У 1926 годзе — ужо 216.

Усё гэта прымушае рабочых стаць на шлях клясавае барацьбы, на шлях, які дыктуе палепшыць сваё становішча сваімі ўласнымі рукамі.

Алёнін.

Працягваем Усебеларускі мітынг!

23 кастрычніка ў Бабруйшчыне.

Прамова тав. Рубінчыка.
(Сакратар Бабруйскага ГК ЛКСМБ)

23 кастрычніка ў дзень генэральнага Ўсесаюзнага суботніке закончыўся і наш суботнік у Бабруйску.

Вось факты і лічбы, якія сьведчаць ня толькі аб уздыме на работах суботніка, але і аб яго вялікіх матар'яльных выніках.

Фанэрны завод. 35 комсамольцаў сталі ля сьвісьцяшчых цыркулярак, варштатаў і грахочучых фрэзэраў.

10 старых рабочых былі на чале суботніка.

Зьмена прапрацавала 8 гадзін. Раніцой прышлі піонэры працаваць на завадзкі панадворак.

А 10 гадзіне дырэкцыя падлічыла заробак, ён раўняўся 75 рублёў.



Бабруйск. Суботнік на шчацінкай фабрыце.

Шчацінная фабрыка. Шчацінычыкі пусьцілі адзін цэх. Усіх удзельнікаў было 40 чалавек. Цікава тое, што прышлі на работу 15 старых майстраў.

На працягу суботніка, майстры так кіравалі работаю, што ніводная хвіліна не прападала дарма.

Матар'яльны эфэкт быў значны. Шчацінычыкі далі 75 рублёў.

Махорачная фабрыка. Таксама як і ў шчацінычыкаў прышло працаваць—40 чал. Таксама, як і ў іх, на чале стаяла 15 чал. старых рабочых майстраў.

Але заробак махорачнай трохі большы, ён перавышае—80 рублёў.

Маслабойны завод. На заводзіку усяго 3 комсамольцы і з гэтых **трох** складаецца ячэйка. І гэтыя **тры** арганізавалі суботнік. Прышоў на работу ўвесь завод,—астатнія 13 чал. рабочых.

Заробак быў—35 рублёў.

Сьпіртагарэлачны завод. У гэтую нядзелю, як і ў мінулыя дні, завод працаваў поўнасьцю.

Ячэйка прыцягнула ўсіх рабочых. Зарабілі—80 рублёў.

Ячэйка профшколы мэталістых. Профшкольцы далі 42 руб. На гэты дзень ім адміністрацыя прадаставіла заказы.

Ячэйка ст. Бярэзіна. За няпоўны рабочы дзень ячэйка зарабіла 100 р. Разам з комсамольцамі працавалі дарослыя рабочыя.

Усяго на чыгуначных рэйках выстраілася 36 чал.

Былі зьменены шпалы... Былі ачышчаны шляхі.

Ячэйка ст. Бабруйск. 66 р. зарабіла ячэйка, папрацаваўшы дзень на шляхох. Разам з 20 комсамольцамі працавала і 10 рабочых.

Чыгуна-ліцейны завод. Было пушчана некалькі цэхаў. Зьявілася ўся ячэйка—15 чал.

Дзень працы даў бяспрытульным 30 р.

Друкарня. Сіламі комсамольцаў 23 кастрычніка—працавала друкарня.

18 комсамольцаў і два старых друкары зарабілі—50 р.

Так прайшоў суботнік на некаторых асобных прадпрыемствах. Апрача гэтага, працавалі ўсе працколектывы,—абутнікаў, краўцоў і інш. Цырульнікі вывесілі вялікі плякат, які адзін толькі вісеў у Бабруйску, выклікаючы гутаркі і зьдзіўленьне:

На Бабруйскім камбінаце, які толькі пачынае расьці з рыштаваньняў, пра авала 140 ч. моладзі. Зарабілі на камбінаце 166 р. На грамадзкіх работах комсамольцы зарабілі 175 р. На пагрузцы 100 р.

Па папярэдніх падліках суботнік у Бабруйску даў каля 3000 р.

Дзьве хаты.

У вясковай ячэйцы.

Слова ўдзельніка т. Рыдлеўскага.

Аб хаце сакратара Чырвона-Слабоцкай комсамольскай ячэйкі ў свой час вяліся вялікія спрэчкі.

Гэта былі гістарычныя спрэчкі, зафіксаваныя у пратаколах нашага комісарыяту і міністэрства замежных спраў Рэчы Посполітай.

Зараз яны захоўваюцца ў незгараемых шафах, як дакуманты гісторыі.

Жыве памяць аб іх і ў Чырвона-слабоцкай ячэйцы і асабліва ў сакратара, які калі ні калі з затаенай пагардаю ўспамінае, як бараніў яго т. Чычэрын.

Справа ў тым, што хата сакратара стаіць якраз на самай граніцы.

Хата на мяжы гумно і хлеў—на пагранічнай зоне, а адно... памяшканьне ў Польшчы.

Польскія прадстаўнікі ўнесьлі прапанову зьнесьці хату. Хату бараніла наша камісія і аб хаце т. Чычэрын гадзіну гаварыў з міністрам Польшчы панам Залескім. Але аб гэтым—між іншым.

... І вось на пасяджэньне бюро ў сакратарскай хаце прыбылі сьвежыя газэты...

Праз поўгадзіны бюро ўважліва абгаварвала суботнік.

Бюро ня ведала што рабіць. Аб суботніку да гэтага, ніхто ня чуў і ня ведаў. Тады рашыл: „паставіць пытаньне“ на сходзе.

На сходзе, як і заўсёды былі сяляне. Момант правядзеньня абгаварэньня, якраз падыйшоў да таго, што бюро ячэйкі ня ведала што сказаць на пытаньне: „што можа зрабіць ячэйка“.

І калі ўспацеўшыя сябры бюро, аніяк не маглі прыдумаць што рабіць дзесьці на задніх лаўках удава якая часьценька хадзіла на сходы папрасіла дазволу сказаць:

— Ці можна мне ў Вас гаварыць!

Удаве далі слова.

І тое што яна сказала было «цэнтрам увагі» суботніка. Удаве пачалі будаваць хату.

Два плотнікі і тры сталяры з старых згадзіліся стаць на чале работ...

Пачалі будаваць... Ужо вырасьлі рыштаваньні, ужо складзены зрубы... І радасная ўдава кожны дзень аглядае пабудову.

Хата будуецца на мяжы, побач з разваленай, старой, у якой раней пражывала ўдава.

Хата і рамонт дарогі былі „цэнтрам увагі“.

Дзесяткі год танулі і гінулі ў гразі сялянскія падводы. Дзесяткі год праклiналі сяляне сябе і ўвесь сьвет за гэтую дарогу.

І зараз ячэйка разам з усёй вёскай працуе на дарозе.

Калісьці польскія газэты пісалі зьдзекваючыя фэльетоны аб хаце сакратара аб упартасьці Наркомзамежных Спраў і беларускага мужыка, якія не хацелі аддаць „Рэспублікі польскай“ ні крока зямлі адваяванай Кастрычнікам.

Няхай-жа яны ведаюць і аб новай хаце, якую будуе ячэйка ленінскага комсамолу, якая будзе разам стаяць з гістарычнай хаткай комсамольскага сакратара.

Прышлі сумесна з жонкамі.

Прамова таварыша Романіна.

Ня гледзячы на тое, што наша ўстанова налічвае ўсяго толькі дзесяць супрацоўнікаў, па інцыятыве комсамольцаў было ўхвалена правесьці суботнік.

На агульным сходзе беспартыйны супрацоўнік Шапіра прапанаваў працаваць на складзе, заняцца фізычнай працай. Гэтак і было зроблена.

У нядзелю, 23-га кастрычніка, уся кантора Паўночкаўгандлю працавала на складзе. Частка супрацоўнікаў прышлі з з жонкамі, хутка размеркавалі работу і праца закіпела. Адны кляяць папяросы, другія складаюць у пачкі, трэція носяць скрынкі, нібы на сапраўднай тутуновай фабрыцы.

Мы, комсамольцы Паўночкаўгандлю, дзякуем дарослым супрацоўнікам за актыўны ўдзел у суботніку. Няхай і нашы зробленыя 18 рублёў памогуць бяспрытульным дзецям.

Гэткім чынам, ячэйка КСМ Хлебапрадукту зрабіла 3 суботнікі. Цяпер чарга за Белмясгандлем, якія яшчэ не прачнуўся.

Белмясгандаль, пралупі вочы.

Весела, організавана, колектыўна.

Прамова сакратара Грэскага РК ЛКСММБ тав. Зянюха.

Падрыхтоўчая работа да суботніка прайшла добра.

Замосцкая ячэйка (6 чал.) працавалі на рамонце дарогі — зарабілі 6 руб. Грозаўская яч. працавала ў вайсковых частках — зарабілі каля 20 руб. Старыцкая яч. парэзала дровы ў школе—зарабілі 8 руб.

Лепш за ўсё правялі суботнік саўхоскія ячэйкі.

Пакрашаўская яч. уцягнула ў суботнік усіх рабочых саўхозу: вышлі ўсе служачыя, а калі бухгальтар і сыравар хацелі ўвільнуць, дык рабочыя і іх выцягнулі.

Вытворчасьць працы была ў 2 разы большая, чым звычайна. (Звычайна выбіралі за 4 гадзіны 2 радкі бульбы, а на суботніку радок бульбы насыпавалі выбраць у гадзіну. Працавалі весела.

Усяго зарабілі 48 рублёў. У другую нядзелю яч. працавала адна — зарабілі 5 руб. У астатніх саўхозах таксама на працу выходзяць усе рабочыя.

У агульным, суботнік па Грэскаму раёну дасьць каля 200 рублёў. Нашліся і такія ячэйкі, якія не паклапаціліся правесьці суботнік, як Шуляўскоўская (не змаглі знайсьці працы, Аткулаўская (саўхоская) не змаглі падабраць дня для працы) і інш.

Наш узнос—300 рублёў.

(Прамова сакратара ячэйкі архітэктурна-будаўнічага тэхнікуму Харкова).

У мінулым тыдні 38 вучняў нашага тэхнікуму, разам з 18 чырвонаармейцамі сатаварыскай вайсковай часткі, працавалі на двары па выгрузцы зямлі з падвалаў.

У гэтую-ж нядзелю на суботніку было занята 84 чалавекі, з іх—20 беспартыйных вучняў. За дзень хлопцы раскалолі 3 сажні дроў, ачысьцілі падвалы і двор агульнажыцьця і памяшканьня тэхнікуму, выгрузілі вугаль з падвалаў.

30 вучняў тэхнікуму пайшлі на грамадзкія работы. Акрамя гэтага мы далі сваіх 5 дзесятнікаў для кіраўніцтвам суботнікам студэнтаў БДУ.

У суботніку ўдзельнічалі і старэйшыя піонэры. З усяго тэхнікуму на суботніках не было толькі 14 беспартыйных вучняў.

Наш узнос у фонд кастрычнікаўскага падарунку—каля 300 рублёў.

Міліцыя празявала суботнік.

(Прамова тав. Гарланава.)

У свой час ячэйка міліцыі і крымвышуку шмат гаворыла аб удзеле міліцыянэраў у правядзеньні комсамольскага суботніка.

Спачатку думалі паехаць у маёнтак „Чырвоны міліцыянэр“ каб выкапаць там бульбу і зарабіць на карысьць бяспрытульных. Але покуль ячэйка вырашала пытаньне, бульбу ў маёнтку выкапалі сваімі сіламі.

У гэтую-ж нядзелю комсамольцы міліцыі павінны былі працаваць у адміністрацыйным аддзеле акрвыканкому. Але чамусьці да вызначанага часу ні адзін з іх не зьявіўся.

Суботнік быў сарваны.

Ячэйка міліцыі і крымінальнага вышуку налічвае 50 чалавек, а ў суботніку ніхто з іх яшчэ ня прымаў удзелу.

Суботнік на Ляхаўцы.

А. Бараньнікаў.

За тэмп і націск у барацьбе з недахопамі!

Пагроза вайны, якая павісла над нашай краінай, застаецца быць фактам, які Савецкая ўлада і партыя неаднокраць падкрэсьлівалі і падкрэсьліваюць перад рабочай клясай і працоўным сялянствам, выкінуўшы лёзунг на ўмацаваньне абароназдольнасьці краіны.

Вайна будзе галоўнай праверкай для рабочай клясы, працоўнага сялянства, партыі, улады,—праверкай згуртаванасьці, бояздольнасьці. Гэта праверка будзе датычыць комсамолу і ўсёй рабоча-сялянскай моладзі. Вайна патрабуе напружанасьці ўсіх сіл, праяўленьня найвялікшай дысцыплінаванасьці, спайкі, упартасьці і настойлівасьці ў барацьбе з міжнародным імпэрыялізмам.

Ужо зараз да гэтай генэральнай, вялізарнейшай праверкі трэба аглядзецца, праверыць, ці ўсё ў нас на месцы, ці моцна прыкладзены ўсе часткі адна да другой.

За апошні час мы перажылі тры праверкі становішча шэрагаў комсамолу і рабоча-сялянскай моладзі.

Першай праверкай

зьявілася выяўленьне настрояў мас комсамолу ў беспартыйнай моладзі ў сувязі з ваеннай небясьпекай. Мерапрыемствы комсамолу ў галіне масавай ваенізацыі шэрагаў комсамолу і рабочай моладзі (ваенныя манэўры, лягерныя зборы, начныя трывогі, вопытная мобілізацыя ў Гомелі і г. д.) выявілі бязумоўнае разуменьне асноўнай масай комсамолу лёзунгу партыі па абароне краіны, выявілі ў агульным наліччы высокай дысцыплінаванасьці разуменьне ўсёй адказнасьці моманту, зьвязанага з ваеннай небясьпекай.

Без усякіх агаворак трэба прызнаць і тое, што гэта першая праверка паказала і некаторыя адмоўныя бакі ў нашай рабоце па організацыі шэрагаў рабочай моладзі. Асобныя дабраахвотныя выхады з комсамолу на глебе «здрэйфеньня» перад ваеннай небясьпекай, асобныя зьявішчы недысцыплінаванасьці ў страю, асобныя факты, якія робяць дэзорганізуючы ўплыў на ваенную дысцыпліну сярод комсамольцаў.

Другая праверка

гэта Міжнародны Юнацкі Дзень. МЮД, як дзень праверкі баявой згуртаванасьці шэрагаў комсамольцаў, як дзень праяўленьня інтэрнацыянальнай салідарнасьці рабочай моладзі Беларусі з рабочай моладзьдзю ўсяго сьвету,—якраз прайшоў пад гэтымі лёзунгамі. Асноўныя кадры рабочай моладзі вышлі на дэмонстрацыю пад сьцягам КІМ'у, пад кіраўніцтвам комсамолу. Гэты дзень яшчэ раз падкрэсьліў, што толькі комсамол зьяўляецца непадзельным політычным кіраўніком рабочай і працоўнай сялянскай моладзі.

Асобныя недахопы ў галіне ваенізацыі і недахопы, якія выявіліся ў дзень МЮД'у (няпрыманьне ўдзелу асобных груп рабочай моладзі ў дэмонстрацыі) паказваюць нам, што парывы, рэволюцыйны энтузыязм рабочай моладзі часта ідуць далей нашых здольнасьцяў організацыйных. Трэба ўпарта працаваць над тым, каб улічваць настроі самага неразьвітага рабочага хлапца, улічваць у нашых мерапрыемствах кожную дробязь, якая ў якой ступені можа адбіцца на настроі рабочае моладзі, якая прадугледжвала-б самае дробнае няпрыкметнае запатрабаваньне рабочае моладзі.

Трэцяя праверка

гэта разгарнуўшыся ўсесаюзны суботнік, праходзячы ў азнаку 10-цігодзьдзя Кастрычнікавай рэволюцыі. Першы вынік, праходзячага суботніку можа быць толькі адзін, што ўдзел і роля рабоча-сялянскай моладзі ў соцыялістычным будаўніцтве стаіць на высокім узроўні. Гэты суботнік зусім ясна паказвае на вялізарнейшыя творчыя сілы комсамолу і рабочае моладзі. Можна загадзя з упэўненасьцю сказаць, што пры правядзеньні канчатковых вынікаў суботніка мы будзем константаваць, што комсамол і рабочая і сялянская моладзь пасьпешна здадуць экзамен, як сьвядомыя ўдзельнікі соцыялістычнага будаўніцтва.

На фоне абвостранага міжнароднага становішча, на фоне вялізарнейшай работы праводзімай партыяй і рабочай клясай па соцыялістычнаму будаўніцтву, на фоне праверак становішча нашага комсамолу і трэба вызначаць асноўныя задачы работы.

З боку адзінак нізавога актыву ў апошні час бываюць чутны гутаркі аб тым, што абвострапасьць міжнароднага становішча, якая высунула рэальную пагрозу вайны прымушае нас, бач, «шукаць новыя шляхі і задачы нашае работы». Гэтыя гутаркі хаця-б і адзінак, бязумоўна, шкодны і яны зьяўляюцца вынікам неразуменьня ўсіх абставін у жыцьці краіны, вынікам панічных настрояў у сувязі з ваеннай небясьпекай.

Наадварот, усе надворныя і ўнутраныя абставіны краіны, асабліва яскрава ў адносінах КСМ падкрэсьліваюць

неабходнасьць упартага выкананьня задач, высунутых перад комсамолам XIV партзьездам.

Ваенная небясьпека перад краінай паставіла адказьнейшую

задачу ўмацаваньня абароназдольнасьці краіны.

Вырашэньне гэтай задачы партыя, улада, і рабочая кляса знаходзяць, галоўным чынам, ва ўзмацненьні ўсёй работы па гаспадарчаму будаўніцтву. Пытаньні гаспадарчага будаўніцтва набываюць у сучасны момант выключна важнае значэньне і партыя з нябывалай сілай мабілізуе ўвагу да гэтага мас рабочае клясы і працоўнага сялянства.

Нашы задачы раджаюцца задачамі партыі і значыць лёзунг, пад якім працаваў апошнія гады комсамол гэта—«ўдзел КСМ у гаспадарчым будаўніцтве ёсьць стрыжань усёй яго работы» набывае яшчэ большае сваё баявое значэньне і патрабуе свайго выкананьня з прыцягненьнем да гэтага самых шырокіх мас рабочай і сялянскай моладзі. Усе папярэднія нашы рашэньні ў галіне ўдзелу КСМ і беспартыйнай моладзі ў гаспадарчым будаўніцтве павінны ўпарта і настойліва выконвацца.

Абставінамі ў краіне і ўнутраным становішча КСМ некаторыя з пытаньняў, вырашаных XIV зьездам партыі ў сучасны момант найбольш моцна падкрэсьліваюцца і патрабуюць больш умелага і поўнага вырашэньня. Адным з такіх пытаньняў зьяўляецца проблема пролетарскага кіраўніцтва.

Гэта будзе тым больш зразумела,

калі разгледзець маючыяся цяжкасьці ў нашай унутранай рабоце.

Гэтых цяжкасьцяў, прыкладна, коратка можна налічыць пяць.

1. Для нас зьяўляецца пэўным існаваньне асобных зьявішчаў недысцыплінаванасьці, расхлябанасьці, якія пранікаюць у асяродак комсамолу. Па некаторых організацыях гэтыя зьявішчы нават знаходзяць сваё частковае «ажыўленьне». Трэба зразумець, што дысцыпліна ў цяперашніх умовах работы, зьяўляецца пытаньнем сугуба-політычным. Трэба зразумець, што недысцыплінаванасьць перашкаджае пролетарскаму кіраўніцтву, а пры яго нават нязначным «ажыўленьні» можа гэта кіраўніцтва паслабнуць.

2. У асобнай, праўда, нязначнай часткі актыву наглядаецца адсутнасьць упартасьці, настойлівасьці даводзіць справу да канца. Гэта якасьць не пролетарская, варожая рабочай клясе. Актывісты нашага

„АСЛЫ... ІДЫЁТЫ... ДУРНІ“...

Новы слоўнік некаторых комсамольцаў.

Супроць мяшчанства ў комсамольскім асяродку.

Лаянка, бойкі, плёткі.

(Клімавіцкая профтэхшкола, Магілеўскай акругі).

Аб дысцыпліне мы гаворым надта многа. І гэта вядома: без дысцыпліны ня можа быць арміі, больш менш моцнай організацыі, які-б характар яна ня мела, без дысцыпліны ня можа быць і школы.

Але калі гэта зразумела вам, то не зразумела нашым вучням.



Паглядзеце, чаго толькі не хапае ў нас з усяго таго, з чым комсамол вядзе штодзённую ўпартую барацьбу.

— На лекцыях вучні **кураць, лаюцца, б'юцца, а некаторыя нават і зусім не наведваюць іх.**

Выйсьці ў часе перапынку на двор няма ніякай магчымасьці, бо так і глядзі, каб хто-небудзь не «папрабаваў» **твае галавы каменем.**

У школе маецца пяць дзяўчат. Мала. Але больш яны сюды ня пойдуць таму, што **адносіны хлапцоў да ніх вельмі дрэнныя.**

Сярод вучняў **існуюць розныя групоўкі,** якія вядуць паміж сабой барацьбу, распальваюць нацыянальную розьнь чым асабліва адзначаецца першая кляса.

А розных **плётак** — хоць адбаўляй, і ўся бяда ў тым, што ў гэту справу ўцягнуты **нават і настаўнікі.**

Ня лепш і з інтэрнатам. У ім—**брудна, мокра, папсаванае паветра, ва ўсіх кутках павуціна.**

Усё гэта таму, што дрэнна працуе наша комсамольская ячэйка, дрэнна падабраны пэдагагічны пэрсонал і адсутнічае гаспадарскае вока адміністрацыі.

Якуб Далёкі.

„Асёл, ідыёт“.

У Цяцерынскай вучэбна-практыкавальнай майстэрні знаходзяцца, аказваецца, ня вучні, а «аслы і ідыёты».

Так, калі нашаму загадчыку тав. Канечку тэй ці іншы вучань зробіць ня так, як трэба, дык ён і пачынае: «асёл, балда, ідыёт» і г. д.

Мы зварачаемся да «Чырвонай Зьмены», каб яна дапамагла нам суняць гэткага загадчыка.

Малаткоў.



Вучні ў вачох тав. Канечкі,

Увялі мэтад ЦІП'у.

(Менск аб'яднаная профтэхшкола).

З пачатку навуковага году ў нашай школе ўведзены мэтод ЦІП'у карысьць ад якога вельмі вялікая.

Аб гэтым мэтодзе я і хачу сказаць некалькі слоў.

Перад пачаткам работы ўся кляса выстройваецца ў шэрэнгу і 15 хвілін займаецца гімнастыкай.

Потым вайсковым строем вучні ідуць у майстэрню, кожны да свайго станка і па камандзе «пачынай»—пачынаецца кіпучая творчая работа.

Тут, для больш поўнага разуменьня, трэба зрабіць агаворку. Справа ў тым, што для зьнішчэньня малейшых перашкод, у рабоце, у цiскоў маецца дошка з палачкай, на дошцы прылеплены малюнкі, а на палачцы — самыя неабходныя інструманты.

Каля цiскоў, таксама, зроблены яшчэ і пласьцінкі з выразамі, прызначанымі для раскладваньня напільнікаў, што пазбаўляе вучняў ад страты лішняга часу.

Парабіўшы 50 хвілін, хлапцам даецца 5 хвілін адпачынку, у працягу якіх стомлены організм адпачывае і набіраецца новай сілы.

Пасьля ўсёй работы вучні ізноў займаюцца гімнастыкай, на што ідзе, як і ў першы раз, 15 хвілін.

Гэты мэтод вытворчага абучэньня за мест сутулаватага, хваравітага падростка выхоўвае здаровага, поўнага сіл і энтузіязму кваліфікаванага рабочага.

Глыбей мэтод ЦІП'у ў профшколы, які дае магчымасьць пры меншай страце часу дасягнуць самых лепшых вынікаў.

Ціпавец.

Панства безгаспадарнасьці.

(Гарадоцкая профтэхшкола мэталістых).

Наша школа можа шмат чым пахваліцца:—Ну, чым-бы вы думалі?—Сваёю безгаспадарнасьцю.

— Такарных станкоў хоць і не хапае, але аб рамонце трох папсаваных ніхто і думаць ня хоча.

Тыя станкі, на якіх працуюць вучні, слаба замацаваны і пры абточцы хістаюцца.

Рухавік таксама няспраўны і для работы не скарыстоўваецца.

Я прапаную рухавік прадаць і за гэтыя грошы направіць станкі. **Л. С.**

Эканомяць на вучнях.

(Гарадоцкая профтэхшкола мэталістых, Віцебшчына).

Доўга чакалі вучні-стыпэндыяты нашай школы стыпэндыі за жнівень: Грошы патрэбны былі на праезд да месца вучобы.

Не дачакаўшыся, многія паехалі «вайдамі», а некаторыя пашлі пяшочкам; думалі—як небудзь дабярэмся.

Але якое было наша расчараваньне па прыезьдзе на месца вучобы, калі загадчык школы аб'явіў, што стыпэндыя за жнівень месяц выдавацца ня будзе.

І гэта ў той час, калі многія з вучняў жывуць выключна на стыпэндыі.

Няўжо Галоўпрафасьветы ня ўзяў гэтага пад увагу і задумаў з'эканоміць на тым, без чаго ня могуць жыць вучні?

Л. Стэрнін.



„Зьмена“ растлумачвае.

У апошні час многія профшкольцы прысылаюць у рэдакцыю лісты са скаргамі аб тым, што іх ня прымаюць у профсаюз.

Рэдакцыя даводзіць да ведама як іх, так і ўсіх профшкольцаў, што пытаньне гэта ЦК ЛКСМБ узьнята перад ЦСПСБ, рашэньне якога будзе апублікавана ў нашай газэце.

Рэдакцыя.

Удзельнічаем ў конкурсе.

Крушынаўская моладзь будуе радыё.

Ўцягнулі ўсю моладзь.

(Шыйская ячэйка ЛКСМБ, Крупскі раён, Аршанская акруга).

У нашай ячэйцы комсамолу шырока разгарнулася праца па правядзеньні дзесяцігодзьдзя Кастрычнікавай рэволюцыі ў вёсцы **Худаўцы.**

На пасяджэньні бюро ячэйкі была прынята пастанова аб тым, што **10 год рэволюцыі неабходна зрабіць шырокім сялянскім, з вялікай урачыстасьцю, сьвятам.**

Для гэтага рыхтуецца на 6-ае лістапада вялікі сялянскі вечар. Ужо вылучан дакладчык, даручана паасобным таварышом упрыгожыць памяшканьне, напісаць лёзунгі, раздабыць плякаты.

Комсамольская ячэйка заўзята рыхтуе Кастрычнікаўскую п'есу «Расплата».

Моладзь **па сваім жаданьні рыхтуе дэклямацыю, вывучае для расказваньня кароценькія гумарыстычныя апавяданьні, сьпевы, анэкдоты, скокі і г. д.**

Для дапамогі гэтым таварышом і праверкі іх «рэпэртуару» вылучаны ячэйкай два таварышы.

С. Астапенка.

Машынка гутарыць.

(Вёска Крушынаўка, Рагачэўскі раён).

Чуткі аб тым, што пры дапамозе належнай прылады—радыё—можна лёгка чуць, што гаворыць Масква—надзвычайна зацікавілі моладзь.

Абдумаўшы магчымасьць пабудаваньня гэтага радыё ў нашай вёсцы, комсамольцы сумесна з беспартыйнай моладзьдзю парашылі прайсьці з падпісным лістом.

Сабралі каля 20 рублёў. Выпісалі некаторыя часткі, купілі апарат і 18-га кастрычніка ў нас загаварыла машынка.

Цяпер зьбіраем сродкі для набыцьця лепшага радыё. Маем надзею, што да Кастрычнікавай гадавіны і гэта выканаем.

Я. М. Савіцкі.

Уладайце аружжам!

Узмацнім вайсковую работу.

(Менскі Горрайком ЛКСМБ).

Ня так даўно на пленуме гарадзкога райёну камсамолу быў заслуханы даклад аб становішчы ваеннай работы ў райённай організацыі. На гэтым пленуме было выяўлена, што ня гледзячы на правядзеньне райкомам розных мерапрыемстваў па ўзмацненьні ваеннай работы ў гарадзкой організацыі, як нарады, лягерны збор, манэўры усё-ж яна разгарнута не належна: да гэтага часу наглядаўся слабы ўдзел масы членаў організацыі ў практычнай рабоце ваенных гурткоў. Нярэдка можна сустрэць формальнае членства часткі членаў нашай організацыі ў таварыстве ТСА-авіяхіму. Грамадзянскімі ячэйкамі слаба выкарыстоўваецца сатаварыства з вайсковымі групамі ў мэтах ваенізацыі.

Частка актыву нашай камсамольскай організацыі праявіла нясур'ёзныя адносіны да праведзеных райкомам камсамолу масавых мерапрыемствах ваенізуючага характару, як выхады ў лягеры, на манэўры, вопытныя трывогі, гурткі па падрыхтоўцы 1905 году ў Чырвоную армію і г. д.

Выходзячы з усяго гэтага, пленум гарадзкога райкому для таго, каб узмацніць гэты важны вучастак работы комсамолу, каб зьнішчыць паказаныя недахопы, у сваіх пастановах падкрэсьлівае неабходнасьць стварэньня баявое адзінкі (роты) з членаў організацыі, формуючы яе па вытворчым прынцыпе.

Пленум абавязвае ўсіх членаў організацыі вывучыць ваенную справу шляхам прыманьня актыўнага ўдзелу ў рабоце ваенных гурткоў.

Акрамя гэтага пленум лічыць неабходным правесьці конкурс ма ячэйку правільна і прыкладна праводзячую сатаварыскую работу з ваеннай групай КСМ і на комсамольца—лепшага слухача гуртка ваенных ведаў.

Для таго, каб як можна больш пашырыць вайсковыя веды сярод нашай організацыі, пленум лічыў неабходным правесьці работу па організацыі падпіскі на вайсковую літаратуру і газэты; прыняць рашучыя захады да тых таварышоў, якія ня выконваюць дырэктыў РК у адносінах ваенізацыі.

Выканаўшы ўсе гэтыя пастановы, наша організацыя ўпаўне выканае ўскладзеныя на яе задачы па ваенізацыі.

Дырэктывы дадзены. Застаецца толькі іх выканаць.

Левін.

За дрэнны выстрал дзьве капейкі.

Амхініцкая ячэйка КСМ, Лупалаўскага райёну).

Прыбыўшы з акруговых комсамольскіх манэўраў, комсамольцы ўзяліся за ажыўленьне працы свайго вайсковага кутка, праца якога была да гэтага часу амаль што замёршай.

Для гэтай справы комсамольцы сабралі 3 руб. 50 кап., на якія купілі капсуляў, пораху і іншых прыладаў, абралі загадчыка вайсковага кутка комсамольца, які ведае гэтай справай.

Пры гэтым кутку організаваны ў сучасны момант і акуратна кожны тыдзень праводзяцца заняткі вайсковага гуртка. Вывучаюць вінтоўку, праводзяць спаборніцтвы па стральбе, прычым уведзены такі парадак: хто пападзе у цэль з драбінкі, той плоціць за выстрал адну капейку, а хто прамахне, той дзьве капейкі, што дае да некаторай ступені кожнаму страляючаму добра прыцэліцца.

Усё, што маецца ў вайсковым кутку, як, напрыклад, вінтоўка, плякаты і бібліатэчка здабыты на сродкі саміх комсамольцаў.

Язэп Саладкоў.



часу павінен адрозьнівацца сваёй ленінскай закалкай, цьвёрдасьцю, вытрыманасьцю, дысцыплінаванасьцю, плюс палітычная пісьменнасьць, плюс культурнасьць. Толькі такі актывісты можа адпавядаць патрабаваньням далейшага павышэньня палітычнай кваліфікацыі ўсяго нашага кіраўніцтва.

З актывістым, які ня ўмее організоўваць справу, ці давесьці яе да канца, з актывістым «агіткай», з такім, які, каб організаваць цір лічыць неабходным пісаць аграмадныя лісты на тэму «англічанка любіць паскудзіць», з такімі актывістымі трэба змагацца, прымушаць і дапамагаць ім вучыцца і найбольш безнадзейных бязьлітасна «аслабаняць» ад кіраўніцтва.

3. Варожыя зьявішчы выяўляюцца ў асобных праяўленьнях мяшчанскага індывідуалізму, што значыць няўменьні падначаліць свае асабістыя інтарэсы інтарэсам колектыву, грамадзкім. Гэтыя зьявішчы служаць коранем да п'янства, хуліганства, расхлябанасьці і недысцыплінаванасьці.

4. Варожыя нам зьявішчы выяўляюцца ў асобных фактах нацыяналізму. Гэтыя зьявішчы сказваюцца ў пасыўнасьці пры правядзеньні асобных пытаньняў нацыянальнай палітыкі партыі ў жыцьцё (беларусізацыя).

5. Абавязаны констатаваць некаторы рост антысэмітызму. Гэта ганебнейшае зьявішча пранікае ў нашы шэрагі. Факты нам кажуць, што антысэмітызму падпарадкаваны нават асобныя рабочыя актывісты, якія бачаць у яўрэях прычыну ўсіх няшчасьцяў. Факты ператварэньня на асобных прадпрыемствах яўрэйскіх хлапцоў у пасьмешышча, у прадмет зьдзекаў, жартаў, для нас ня выключэньне.

Усе гэтыя **цяжкасьці работы ставяць адказьнейшую задачу барацьбы з імі.**

Гэта барацьба магчыма пры ўразуменьні ўсёй шкоднасьці гэтых недахопаў. Думаць аб тым, што гэтыя хваробы праніваюць наскрозь комсамол і рабочую моладзь няпраўда і глыбока памылкова, яны зьяўляюцца асобнымі зьяўшчамі, але ані ў якай ступені не павінны паслабляць нашу ўвагу да барацьбы з імі. Трэба ўцяміць, што пад дзейнасьцю націску міжнароднай буржуазіі на Савецкі Саюз, варожыя сілы рабочай клясы ўнутры нашай краіны знаходзяць у гэтым націску сабе падтрыманьне, ажыўляючы сваю дзейнасьць у галіне ідэолёгічнага ўплыву на масы рабочай і сялянскай моладзі.

Галоўная задача барацьбы гэта ва ўразуменьні гэтых цяжкасьцяў і небясьпек і ўзмацненьні ўсёй выхаваўчай і масавай работы сярод моладзі на падставе рашэньняў 14-га зьезду партыі.

Гэтыя цяжкасьці асабліва моцна заваструюць неабходнасьць найбольш поўнага вырашэньня задачы дысцыплінаванага пролетарскага кіраўніцтва.

Гэта задача павінна вырашыцца шляхам вялізарнага націску на выкананьне лёзунгу «сто процантаў рабочай моладзі ў комсамол»; націску на ўцягненьне батрацкай і бядняцкай і сапраўды лепшай часткі серадняцкай моладзі ў саюз; націску на вылучэньне рабочага і батрака ў актыве; у паляпшэньні і ўмацаваньні партыйнага кіраўніцтва, націску на паляпшэньне кіраўніцтва; комсамолу над піонэрскімі організацыямі; на асобныя недахопы ў нашай рабоце; на якасьць нашай выхаваўчай і масавай работы,—на павышэньне тэмпу ўсёй нашай саюзнай работы.

«Больш, чым калі-б то ні было комсамол павінен орыентавацца на масы, у першую чаргу на масы рабочае моладзі». Гэта паказаньне 14-га партзьезду павінна як ніколі пранізаць нашу работу, ужыўшы захады да разуменьня гэтага становішча самым адсталым радавым комсамольцам.

Апошні пленум ЦК ЛКСМБ паказаў, што з надыходам 15-га партзьезду, опозіцыя ў партыі кіне усе свае сілы на барацьбу супроць лініі партыі, яе ленінскага ЦК. Пленум ЦК ЛКСМ паказаў, што ўся наша работа павінна быць на ўвесь бліжэйшы пэрыод пабудавана пад баявым лёзунгам «Ніводнага опозіцыянэра ў КСМ». Гэты лёзунг дае нам тэмп націску ў галіне прапрацоўкі рашэньняў партыі і іх уразуменьня.

З надыходам 10 цігодзьдзя Кастрычнікавай рэволюцыі і 15-га партзьезду задачы ўсваеньня лініі партыі набываюць вялізарнейшае значэньне і ня было-б лепшага падарунку для партыі ў дзень 10-годзьдзя Кастрычніка і 15-партзьезду, як глыбокая прапрацоўка яе рашэньняў і іх уразуменьня.

Рыхтуйцеся маладыя лётнікі.

У лістападзе і сьнежані пачынаецца набор у Ленінградзкую ваенна-тэорэтычную школу авіацыі.

У гэтым годзе ў лістападзе і сьнежані пачынаецца набор у школу авіацыі. У гутарцы з нашым супрацоўнікам адказныя працаўнікі **ТСА-авіяхіму БССР** паведамілі яго аб наступным:

— Умовы прыёму гэтага году на многа розьняцца ад умоў мінулага. Цяпер павялічан доступ у школу **асобам старэйшага ўзросту.** Будуць прымаць **ад 18 до 25 год.** Раней прымалі ад 18 до 23 г.

— Наконт патрабуемай адукацыі маюцца таксама зьмены. Будуць прымаць скончыўшых сямігодкі, школы ФЗУ, профшколы і паогул школы ім роўныя. Пажадана мець веды якога-небудзь рамества: **сталярнага, сьлясарнага, такарнага, модэльнага ці рухавіка ўнутранага згараньня.**

— Умовы прыёму ў адносінах **соцыяльнага становішча і здароў'я** застаюцца ранейшымі.

— У адносінах партыйнага і комсамольскага складу, прадугледжваецца наступная разьвёрстка для **Беларусі: 20** проц. членаў КП(б), **60** проц. членаў ЛКСМБ, **20** проц. беспартыйных.

— У адносінах **сацыяльнага складу** для **Беларусі,** разьвёрстка наступная: **60** проц. рабочых, **30** проц. сялян, **10** проц. іншых.

— Апрача гэтага **да заявы** патрэбна справка аб адносінах да вайсковай павіннасьці, соцыяльным становішчы і адукацыі.

— Увесь набор у школу будзе праводзіцца органамі ТСА-авіяхіму на **мясцох.** Адборачная камісія пачынае працаваць у **Смаленску з 15** лістапада па **5** сьнежня. **У** Менску ў гэтым годзе мэдагляду ня будзе. **Мэдагляд будзе праводзіцца толькі ў Смаленску і Ленінградзе.** Адабраныя цэнтральнай камісіяй ў Менску будуць пасылацца ў Смаленск,—ільготы на праезд будуць прадстаўлены.

— Пачатак заняткаў ў школе **15** сьнежня.

— **З кожным годам колькасьць месцаў для Беларусі павялічваецца. Наступны набор для БССР раўняецца—98 месцам.**

— Набор будзе праходзіць вельмі організавана. Школа патрабуе моцных, вытрыманых і адважных байцоў,—рэспубліка іх дасьць.

Ал. К.

Гаворыць пакаленьне Кастрычніка:

Да вялікага 10-годзьдзя мы прыходзім з вялізарнымі посьпехамі. Усё новыя кадры моладзі ўцягваюцца ў вытворчасьць. Паляпшаецца яе кваліфікацыя. Ліквідавана яе няпісьменнасьць. Дадзена ёй магчымасьць актыўна ўдзельнічаць у соцыялістычным будаўніцтве.

На менскай агульна-гарадзкой конфэрэнцыі рабочай моладзі.

„Гарачае пытаньне“.

Сёньня „гарачае пытаньне“ — аб **эканомічна-адукацыйнай працы сярод рабочай моладзі.**

Ад кожнага заводу, прадпрыемства—дэлегацыя. У кожнай дэлегацыі свой „важак“, які сёньня павінен выступіць. Дэлегаты даюць „важакам“ настаўленьні аб чым гаварыць. Кожная дэлегацыя хоча расказаць конфэрэнцыі аб буднях свайго прадпрыемства.

Профшкольцы — аб прыёме ў профсаюз. Аб павялічэньні стыпэндыі.

Вучні вытворчых майстэрняў — аб тым, што цяжка знайсьці работу пасьля набыцьця кваліфікацыі.

„Фабзайчаты“—аб пераводзе ў вышэйшыя разрады.

Вынаходцы, што „адзін у полі ня воін“.

Профактыў моладзі—аб броні.

Бранявікі—аб разбраніраваньні.

Дакладчык тав. **Шнэйдар** павінен даць адказ на ўсе гэтыя пытаньні. Вось чаму так уважліва слухалі яго дэлегаты Ён гаварыў аб буднях рабочай моладзі, аб блізкім, усім знаёмым.

У нашым палку прыбыло.

Тав. **Шнэйдар** пачынае свой даклад лічбамі аб колькасным росьце рабочае моладзі на вытворчасьці.

Расьце лік рабочае моладзі—сябраў вытворчых профсаюзаў.

1-га кастрычніка 1925 году было іх **2186 чалавек**, што складае 15,7 проц. да агульнага ліку сябраў вытворчых профсаюзаў.

1-га кастрычніка 1927 году — **2832. чал.** Ужо 23,2 проц.

Як відаць, процант рабочай моладзі ў профсаюзах расьце, бо з кожным годам усё большыя і большыя калёны моладзі ўцягваюцца ў вытворчасьць.

Плюсы і мінусы.

Рабочая моладзь Менску ўдзельнічае ў соцыялістычным будаўніцтве. У 1926 годзе у вытворчых камісіях налічвалася каля 4 проц. моладзі. Цяпер—больш 7 проц. **Дысцыпліна паднялася паўсюды.** Праводзяцца конкурсы на найлепшага маладога рабочага. Утвараюцца тэхнічныя гурткі.

Але адначасова ў нас заўважваюцца: **няўменьне моладзі высоўваць пытанькі наконт рацыяналізацыі вытворчасьці;** дрэннае наведваньне рабочых сходаў; нерэгулярная ўплата сяброўскіх узносаў у профсаюз. Слабы ўдзел у вытворчых нарадах.

Дзьве „чашки весов“... Якая перацягне?

Бязўмоўна—перацягне першая!

Аб гэтым яскрава сьведчыць **павялічэньне сьвядомасьці рабочай моладзі.**

Трэба канстатаваць, што **зусім ужо няма няпісьменных сярод рабочай моладзі.** Ёсьць толькі невялічная група малапісьменных. Яны займаюцца ў лікпунктах.

Расьце новае пакаленьне культурных пролетарыяў. Аб гэтым сьведчыць узмацнёўшаяся цяга рабочай моладзі да вучобы.

У нас зараз 1015 чалавек беспрацоўнай моладзі. Частка з іх будзе паслана ў якасьці броні на работу.

Організаваны 2 працколектывы на сто чалавек.

Да Кастрычнікавага сьвята будзе паслана на работу яшчэ 150 падлеткаў.

* * *

Пачаліся спрэчкі. Усе думкі, настроі, жаданьні рабочай моладзі прынесьлі дэлегаты на конфэрэнцыю.

Калі пачынае гаварыць дэлегат аб жыцьці свайго заводу ці фабрыкі, тады групуюцца астатнія дэлегаты таго-ж прадпрыемства. Яны сочаць за кожным яго словам, быццам-бы ўсе яны выступаюць перад конфэрэнцыяй.

Калі-ж прымуць у профсаюз?

Аб цяжкасьцях пры падшуканьні работы пасьля набыцьця кваліфікацыі, аб тым, што ў профсаюз ня прымаюць, што неабходна палепшыць матар'яльнае становішча моладзі,—гаварылі т. т. **Эфрон** (вучэбна-вытворчыя майстэрні) і **Турэцкі** (аб'яднаная профтэхшкола).

Кваліфікацыя адна—работа другая.

Тав. **Гіршын** (курсы ЦІП) гаворыць пра дзяўчыну, якая скончыла курсы ЦІП, а працуе прыбіральшчыцай. Другая дзяўчына скончыла мэтал-цэх аб'яднанай профтэхшколы, а працуе прыказчыцай.

Тав **Глюке** (фабвавуч гарбароў) расказвае, як 4 дзяўчыны скончылі школу і былі пасланы на чорную работу.

Тав. **Рубін** (завод „Пролетары“) кажа:—у нас 8 бранявікоў атрымалі працу не па сваёй кваліфікацыі.

Аб гэтым-жа паведамляе тав. Чартоў (ад шаўцоў).

Ня вучоба, а чахарда.

Многія дэлегаты конфэрэнцыі гаварылі аб тым, што часта пераводзяць вучняў ад аднаго майстра да другога. Часта майстры мяняюцца, што значна адбіваецца на вучобе.

Адным словам—ня вучоба, а чахарда.

Што даў конкурс?

Тав. **Айзенштат** (ад харчавікоў) спыніўся на конкурсе «За лепшага майстра і вучня», які правялі. У выніку—**вучні працуюць куды лепш.** Майстры сталі другімі.

Агляд зьнішчыў недахопы.

Агляд нашай абутковай фабрыкі, які правяла рэдакцыя **„Чырвонай Зьмены“**,—кажа тав. **Юдовіч**,—дапамог нам у зьнішчэньні нашых недахопаў. А да гэтага часу ў нас мала ўвагі зьвярталі на набыцьцё моладзьдзю кваліфікацыі. Разрады павышалі толькі праз 8—9 месяцаў.



Прызыдыум конфэрэнцыі. Гаворыць тав. БАРАНЬНІКАЎ. У сярэдзіне за сталом прэзыдыуму старшыня конфэрэнцыі — тав. КРАСОЎСКІ.

Пытаньне вырашае... бутэлька.

Дэлегатка з гуты „Пролетары“ скардзіцца:

— У нас майстар вучыць толькі за „бутэльку рускай“. **Вучню, які ня робіць „бутэлькавыя падарункі“ майстру, пагражае небясьпека застацца чорнарабочым.**

Профсаюз упіраецца.

Тав. **Каплан** (ЦСПСБ) ня згодзен з думкай аб прыёме профшкольцаў у саюз. Мы,—кажа ён,—прымаем у саюз толькі працуючых па найму.

* * *

На многія цікавячыя моладзь пытаньні адказаў сакратар ЦК ЛКСМБ тав. Бараньнікаў, якога конфэрэнцыя выслухала з вялікай увагай.

Тав. **Бараньнікаў**, паміж іншым, інформаваў конфэрэнцыю, што пытаньне аб прыёме профшкольцаў у саюз вырашаецца зараз у ЦК ЛКСМБ.

Вялізарнейшая праверка.

Паведамленьне тав. Курціка аб комсамольскім суботніку.

Рэха слаўных, крывёю, барацьбой, гэроізмам і бальшавіцкім напорам насычаных дзён—рэха ваеннага комунізму зараз пранеслася прызыўным заклікам па ўсёй нашай Эсэсэрыі. Гэта рэха—суботнікі.

Першапачаткова, калі справа толькі зарадзілася, знаходзіліся глыбокадумныя таварышы, якія, пачухваючы патыліцы, гаварылі, што нічога ня выгарыць.

— **Выгарала!**

На першым месцы ідуць: **шкляны завод «Пролетары»**—працавалі 3 зьмены, усе рабочыя. Зарабілі 500 рублёў. **Меншвэй**—працавалі ўсе рабочыя. Зарабілі каля 700 рублёў. Пасьля суботніка правялі мітынг. **Эльвод**—працавалі ўсе. Была дакладная падрыхтоўка. Зарабілі каля 400 рублёў.

З ня меншым посьпехам прайшлі суботнікі ў **чыгуначнікаў, гарбароў і друкароў.**

Суботнікі былі праведзены амаль па ўсіх прадпрыемствах, дзе працуе моладзь.

Суботнік на карысьць бяспрытульных ахапіў сотні і тысячы дарослых рабочых.

Суботнік зьявіўся ня толькі мобілізацыяй сіл, ня толькі працягненьнем вялікага пачыну, ня толькі дапамогай бяспрытульным. Суботнік — вялізарнейшая **праверка** нашых дзён. Гэтая праверка паказала, што да 10-цігодзьдзя Кастрычніка **ленінскі комсамол прыходзіць зьвязаны тысячамі драбнейшых ніцяў з найшырокімі масамі рабочай моладзі.**

На закліку комсамолу тысячы, сотні чалавек вышлі на работу, відочна паказалі хто іх правадыр і кіраўнік.

* * *

На дакладу тав. **Курціка** была вынесена рэзолюцыя, якая зазначае, што суботнік зьявіўся доказам найвялікшай сувязі комсамолу з шырокімі масамі працоўнай моладзі.

* * *

Конфэрэнцыя скончана. 1200 лепшых прадстаўнікоў рабочай моладзі Менску азірнуліся на пройдзены за 10 год шлях.

Праверка зроблена.

З рэволюцыйным энтузіязмам—за будоўлю соцыялізму!

Усе, як адзін.

Пролетарскі маладняк сталіцы, поўны рэволюцыйнага энтузіязму, сустракае 10-ю гадавіну Кастрычніка.—Самы актыўны ўдзел у рэалізацыі індустрыяльнай пазыкі і ў комсамольскім суботніку—яе падарунак да сьвята.

Характэрнай асаблівасьцю толькі што закончыўшайся агульна-гарадзкой конфэрэнцыі Менскай рабочай моладзі зьяўляецца яе нябывал**ая масавасьць.** Тысячная армія дэлегатаў конфэрэнцыі прадстаўлялі каля 4 тысяч кадраў пролетарскага маладняка сталіцы. Дэлегаты ўсе, як адзін, зьяўляліся на пленарныя пасяджэньні конфэрэнцыі. Дэзэртыраў ня было.

Конфэрэнцыя выклікала **надзвычайна вялікую актыўнасьць і рэволюцыйны энтузіязм яе ўдзельнікаў.**

З вялікай увагай конфэрэнцыя выслухала даклад аб нашых дасягненьнях за 10 год рэволюцыйнага будаўніцтва. Але справа ня толькі ў дакладзе. Самі дэлегаты ў сваіх выступленьнях са шчырым уздымам гаварылі аб тых новых правох, новых умовах жыцьця і вучобы, якія дала рабочай моладзі Кастрычнікая рэволюцыя. Гэтыя правы моладзь выкарыстала, прымаючы самы актыўны ўдзел у штодзённай працы па соцыялістычным будаўніцтве. Удзел у рацыяналізацыі вытворчасьці, у вытворчых нарадах на фабрыках і заводах, праца ў саветах, барацьба за зьніжэньне цэн, наступленьне на бюрократызм, амаль пагалоўная вучоба рабочага маладняка... хіба гэта ня тое, што мог даць рабочай моладзі вялікі Кастрычнік?

Напярэдадні 10-й гадавіны гэроічнай барацьбы за першую ў сьвеце соцыялістычную краіну **Менская рабочая моладзь яшчэ раз даказала сваю поўную адданасьць справе пролетарыяту.**

Самы актыўны ўдзел у рэалізацыі пазыкі індустрыялізацыі, адзіна-душнае падтрыманьне ўсесаюзнага комсамольскага суботніка—яе падарунак да гадавіны Кастрычніка.

Конфэрэнцыя абрала дэлегацыю ад рабочай моладзі гораду для прывітаньня сваіх старэйшых братоў—барацьбітоў за Кастрычнік, якія зьбіраюцца на ўсебеларускі зьезд профсаюзаў. Гэтай дэлегацыі дадзен наказ—выявіць на зьезьдзе тыя дасягненьні, якія мае рабочая моладзь за 10 год свайго ўдзелу ў профэсыйнай працы і запэўніць старэйшых братоў, што моладзь—за імі.

Конфэрэнцыя скончылася. Наша задача ажыцьцёвіць яе пастановы на справе, а таксама пазнаёміць з імі шырокія гушчы працоўнай моладзі. Кожны дэлегат павінен даць справаздачу аб конфэрэнцыі і сваім удзеле ў ёй.

Пролетарскі маладняк сталіцы з вялікім уздымам і рэволюцыйным энтузіязмам сустракае надыходзячае 10-годзьдзе Кастрычніка.

Красоўскі.

Ведай гісторыю Кастрычніка.

10 год назад.

27 і 28 кастрычніка.

Часовы ўрад Керанскага, прыціснуты да сьценкі бальшавікамі і „Рабочим Путем“, якія своечасова выкрылі яго контррэволюцыйныя намеры і апавясьцілі аб іх шырокім масам, каб канчаткова ня пасьці ў вачох народу, спрабуе вывярнуцца, прыкрываючыся ілжывымі і фальшывымі сказамі...

Яшчэ ўчора афіцыйна паведамлялася, што „Урад пераяжджае ў Маскву, лічачы становішча ў Петраградзе ненадзейным“. Яшчэ ўчора ва ўрадавых колах адкрыта віталі рашэньне Керанскага аб здачы немцам **Петраграду**, жадаючы тым самым згубы гораду, рэволюцыйнаму флёту, гарнізону і саветам.

А сёньня—напалоханыя народным абурэньнем, у непарадку адступаючы перад гарнізонам і флётам, рашыўшымі, як бы там ні было, абараняць сталіцу—прадстаўнікі ўраду, блытаючыся і супярэчачы адзін аднаму, трусьліва імкнуцца апраўдацца перад рэволюцыяй, якой явы яшчэ ўчора зьбіраліся здрадзіць...

Адступаючы і замазваючы факты, **адкрыта** абвяргаючы сваё ранейшае „вяўхільнае“ рашэньне аб пераезьдзе ў Маскву, Керанскі выступае з шэрагам абвінавачваньняў па адрасу нашай партыі, лемантуе аб „ворагах рэволюцыі, якія вядуць масы па небясьпечнаму шляху,—бальшавіках“, імкнецца давесьці, што ўсе беды паходзяць ад нашай партыі.

Але дарэмна! Масы ўжо ведаюць за кім ісьці, хто іх прыяцель, а хто вораг. І нікчэмная, бязгрунтоўная контр-агітацыя ўраду не дае ніякіх вынікаў.

* * *

Няўхільнае пашырэньне ўплыву нашай партыі на заходнім фронце і, у прыватнасьці, у Менску, спадарожваецца ў гэтыя дні яе колькасным ростам. На бальшавіцкіх мітынгах заўсёды вялічэзныя натоўпы; прамовы ўжо стаўшых популярнымі т. т. **Мясьнікова, Ляндэра і Кнорына** заўсёды знаходзяць спачуваючыя водгукі ў масах. Рэдакцыя партыйнай газэты **„Буревестник“** літаральна закідваецца рабочымі і салдацкімі лістамі.

У дні, аб якіх ідзе гутарка, Менскі савет і, у прыватнасьці, яго бальшавіцкая фракцыя, зрабіўся асяродкам і **галоўным рухавіком палітычнага жыцьця ня толькі ў Менску, але і па ўсёй Беларусі.**

Бальшавіцкая фракцыя настаўляе ўвайсьці ў „камітэт ратунку рэволюцыі“, створаны па пачыну франтавога камітэту (здрадніцкага), каб утрымаць у сваіх руках ініцыятыву і яшчэ больш згуртаваць вакол сябе масы. Дзякуючы гэтаму ўваходу, згоднікі ня здолелі разгарнуць сваей палітыкі, і прымушаны былі некаторы час ісьці на поваду бальшавікоў.

Сёньня адчыняецца зьезд профсаюзаў.

Сёньня, 27 кастрычніка, адчыняецца ўсебеларускі зьезд профсаюзаў ў памяшканьні Дому Культуры.

У працы зьезду прымуць удзел 400 прадстаўнікоў профорганізацый БССР, якія амаль усе ўжо зьехаліся.

Парадак дню: справаздача ЦСПСБ; масавая работа ў профсаюзах; справаздача Галоўсоцстраху; даклад Наркам Аховы Здароў'я і інш.

На першым урачыстым адчыненьні зьезду выступіць сакратар ЦК КП(б)Б тав. Кнорын з дакладам аб міжнародным становішчы.

Маеш облігацыю?

Кожны павінен падпісацца на пазыку індустрыялізацыі.

«Дрэваапрацовачнік» даў 3000 рублёў.

З 175 рабочых заводу **„Дрэваапрацовачнік“** на пазыку індустрыялізацыі падпісалася 148 чалавек на суму **3000 рублёў.**

Рабочы мэханічнага цэху тав. **Вэнжык** падпісаўся на 100 проц. сваёй зарплаты.

З моладзі набылі облігацыяў пазыкі 75 проц. іх колькасьці.

Комсамолец **Гэцаў** падпісаўся на 60 проц. сваей зарплаты. Вучні заводу набылі кожны па $^{1}/_{5}$—$^{2}/_{5}$ облігацыі пазыкі.

«Што ты мне галаву дурыш?».

Так адказвалі комсамольцы шчаціннай фабрыкі т. т. **Цырлін і Рацінер** падышоўшаму да іх зборшчыку падпіскі на пазыку.

Астатнія-ж комсамольцы фабрыкі ўсе падпісаліся на пазыку індустрыялізацыі.

Комсамолец Каган, атрымоўваючы 100 рублёў у месяц, падпісаўся на 75 рублёў, беспартыйны рабочы Лукашынскі—**на** 70 рублёў.

Усяго падпіска на фабрыцы дала 2320 рублёў, што складае 31 проц. агульнай сумы зарплаты рабочых.

Не падпісаліся толькі 3.

На сходзе комсамольскай ячэйкі і рабочай моладзі заводу **„Чырвоная Зара“** быў заслуханы даклад аб значэньні пазыкі індустрыялізацыі.

У выніку—усе комсамольцы заводу падпісаліся на пазыку. З беспартыйнай моладзі не падпісаліся толькі 3 чалавекі.

Усяго на **„Чырвонай Зары“** рэалізавана пазыкі на 3200 рублёў.

СУД.

„Апошні сёнешні дзянёчак“...

У вёсцы Кручы (Аршаншчына) вывесілі мобілізацыйныя плякаты. Грамадзянін **Ткачоў Саўка** прачытаў плякат і адзначыў:

— Забяруць-такі, чэрці... Нічога, не прападзем...

І зьвярнуўся да сабраўшыхся:

— Бачыце, іду служыць на абарону вашых зямель. Эх, і гульнём-жа сёньня...

Вечарам **Ткачоў** запрасіў яшчэ двух будучых «абаронцаў» да сябе ў хату: здабылі самагону—і пачалося сьвяткаваньне „апошняга дзянёчку“.

Пілі шмат, аб абароне гаварылі яшчэ больш. **Ткачоў**, які калісьці бачыў як навучаюцца чырвонаармейцы, махаў рукою і крычаў:

— Кругом, налева, шагам арш!..

Потым ап'янеўшы **Ткачоў** павёў сваіх таварышоў змагацца з „цёмнымі сіламі“—на галоўную вуліцу вёскі.

Таварышы хутка разышліся, а за Ткачовым бегала палова вёскі... ён крычаў.

— Дайце дарогу! Мы гэтым акулам дадзім!..

Сьпяваў—„Апошні сёнешні дзянёчак“...

Усё закончылася-б ціха, каб не падвярнуўся адзін хлапец.

— Саўка, ідзі да хаты,—сказаў ён. Ткачоў адказваў:

— Ніякіх чэмбэрленаў ведаць ня хочу. Ты, можа, акула якая-небудзь,—і ён накінуўся на хлапца. Пакуль сяляне адумаліся, хлапец добра атрымаў. Буяна Ткачова ледзь-ледзь супакоілі.

Справу разглядзеў нарсуд 9-га вучастку. Суд устанавіў, што Ткачоў дэбешырыў на вёсцы ў п'яным выглядзе, зьбіў хлапца.

Падсуднага прыгаварылі да двух месяцаў турэмнага зьняволеньня. Акрамя гэтага, рэволюцыйны трыбунал той дывізыі, куды трапіць Ткачоў, у другі раз разгледзіць гэтую справу.

У тры радкі.

○ Пры Белдзяржмузэі **адчыняецца аддзел беларускага старасьвецкага мастацтва.** Ужо наступілі экспонаты 6—8 стагодзьдзяў.

○ За жнівень і верасень месяцы ячэйкі МОПР'у БССР сабралі **на карысьць політзьняволеных у замежных краінах каля 10 тысяч рублёў.**

○ За мінулы год па Менскай акрузе **разьмеркавана сярод працоўных яўрэяў 320 дзесяцін зямлі.**

○ У Віцебскай акрузе **заканчваецца пабудова новай электрастанцыі**, якая дасьць сьвятло 40 сялянскім гаспадаркам.

○ У БССР існуе **55 нацыянальных сельсаветаў**, якія працуюць на яўрэйскай, польскай, літоўскай і латыскай мовах.

○ Рабочыя будаўнікі БССР **сабралі звыш 10 тысяч рублёў на пабудову самалёту „Пастройка“.**

○ У дашкольных установах БССР (дзіцячых садох, ачагах і інш.) выхоўваецца **3254 дзяцей.**

○ Наркамат Аховы Здароўя адпусьціў **500 рублёў на барацьбу са шкарлятынай па Менскай акрузе.**

○ У Менску **адчыняецца цэнтральны сухотны дыспансэр на 50 ложкаў.**

○ **Скончыўся конкурс на лепшую пажарную дружыну БССР;** першую премію атрымала **Дабрыцкая дружына** (Койданаўшчына).

○ У выніку кампаніі ашчаднасьці, **па Мазырскай акрузе ўступіла ў ашчадныя касы 1070 новых укладчыкаў.**

○ **На Асінастроі заканчваецца пабудова рабочага пасёлку ў Выдрыцах.**

На хвалі 1155 мэтраў.

(Менская радыё-станцыя імя Саўнаркому БССР).

Сёньня а 7 гадзіне станцыя перадае трансьляцыю ўсебеларускага зьезду профсаюзаў.

З пятніцы, 28-га кастрычніка да 5-га лістапада, з прычыны таго, што будуць рабіцца пробныя перадачы новых установак, рэгулярнай перадачы ня будзе.

Адказы чытачом:

Б. Гільману № (1230): Калі ты працуеш ужо 8 месяцаў, дык маеш права быць прынятым у профсаюз.

Соршэру (№ 1231). Курсы кіно-мэханікаў у гэтым годзе не адчыняюцца.

Залеўскаму (№ 1232): У Чырвоную армію прызываюцца хлапцы, якім 21 год.

Красуцкаму (№ 1233): Калі табе райком ня выплаціў належную пэнсію і акругком не зьвярнуў на гэта аніякай увагі, зьвярніся ў АК КП(б)Б ці ЦК ЛКСМБ.

Яму-ж (№ 1234): Дабравольцаў у Чырвоную армію цяпер ня прымаюць.

Букланаву (№ 1235): У ліцейны цэх, які адчыняецца ў Менску, будуць прыняты рабочыя з Менскай Біржы Працы.

Куды пайсьці?

У кіно „Спартак“ дэманструецца фільм—**„Чортава кошачка“.**

Сёньня 2-гі Белдзяржтэатр ставіць—**„Астап“.** Заўтра трэцяя пастаноўка ў сэзоне—твор Шэксьпіра **„Сон у летнюю ноч“.**

Тэа-кіно-кор, ведай!

Запіс у гурток Тэа-кіно-котаў пры „Чырвонай Зьмене“ праводзіцца штодзённа ў памяшканьні рэдакцыі (Комсамольская, 25) ад 12 да 1 гадз. дню і ад $5^{1}/_{2}$ да $6^{1}/_{2}$ гадз. увечары ў тав. **Таўбе.**

Абвесткі

У пятніцу, 28 кастрычніка, у памяшканьні 3 і 9 сямігодак (пляц КІМ'у) адбудуцца заняткі комсамольскай політшколы 1 і 2 ступені.

У пятніцу—апошні дзень прыёму ў школу. Комсамольцы, якія па якіх-небудзь прычынах не пасьпелі паступіць у школу, павінны зьявіцца ў пятніцу а $6^{1}/_{2}$ гадзіне ў 16 пакой (2-гі паверх).

У нядзелю, 30 кастрычніка, а 7-й гадзіне ўвечары ў клюбе „КІМ“ адбудзецца інструкцыйны даклад для комсамольскіх дакладчыкаў на тэму „Кастрычнік і моладзь“. Ячэйкам вылучыць па два дакладчыкі.

Адказныя рэдактары: А. БАРАНЬНІКАЎ. А. КУРЦІК.

Галоўлітбел № 24867. Менск, 1 друкарня БДВ.